# АД РЭДАКТАРА

На працягу паўвека знаходжання „Нівы" на чытацкім рынку журналісцкі калектыў газеты выдатна ўспамагаюць карэспандэнты — няштатныя супрацоўнікі, якія сваімі допісамі ўзбагачаюць змест тыднёвіка і прапагандуюць сваё асяроддзе на старонках газеты. Першыя карэспандэнцыі з глыбінкі паявіліся ў „Ніве" зараз пасля выхаду першых нумароў і працягваюць з'яўляцца на яе старонках да сённяшняга дня. Друкаваліся ў нашым тыднёвіку сотні карэспандэнтаў. А былі імі актыўныя чытачы, якія не абмяжоўваліся толькі да чытання газеты, але адгукаліся на ніўскія артыкулы і паведамлялі рэдакцыю аб тым, што дзеецца ў іх асяроддзі, у іх мястэчку ці вёсцы. У ліку карэспандэнтаў былі ў нас настаўнікі і акадэмічныя выкладчыкі, студэнты і школьная моладзь, сяляне і рабочыя, чыноўнікі, людзі шматлікіх прафесій не толькі з Беласточчыны, але і з розных бакоў краіны і замежжа.

Неацэненая роля карэспандэнтаў, іх важкі ўклад у творчыя здабыткі нашага выдання падказалі нам задуму выдаць падборку найбольш цікавых і найбольш характэрных для паасобных перыядаў допісаў — свайго роду люстра, у якім адбіваюцца ўсе тыя пытанні, якімі тады жыло наша грамадства. Матэрыял у кніжцы падзелены на пяць храналагічных раздзелаў — дзесяцігоддзяў, а ў рамках паасобных дэкад допісы сабраны ў тэматычныя групы.

Прапанаваная кніга — гэта анталогія публіцыстычна-інфармацыйнай актыўнасці карэспандэнтаў, якія на працягу паўвека дзяліліся з чытачамі сваімі радасцямі і смуткамі, роздумамі над акружаючай нас рэчаіснасцю. Выданне ўшаноўвае таксама іх уклад у духовае жыццё беларусаў Беласточчыны.

**Віталь Луба**